# ПРАЕКТ COMPASS: НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ МІЖНАРОДНАГА НАВУКОВА-АДУКАЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

З 2018 года Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт удзельнічае ў рэалізацыі праекта COMPASS – «Комплекснае павышэнне патэнцыялу ва Усходнім суседстве і Цэнтральнай Азіі: інтэграцыя даследаванняў, эфектыўнае кіраванне і ўстойлівыя супольнасці» (англ. – «GCRF COMPASS: Comprehensive Capacity-Building in the Eastern Neighbourhood and Central Asia: research integration, impact governance & sustainable communities»).

Праект ажыццяўляецца ў 2018–2021 гг. кансорцыумам у складзе Універсітэтаў Кента і Кембрыджа (Вялікабрытанія), Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Універсітэта АДА (Азербайджан), Таджыкскага нацыянальнага ўніверсітэта, Універсітэта сусветнай эканомікі і дыпламатыі (Узбекістан). Праект COMPASS фінансуецца Даследчым фондам па глабальных выкліках (Global Challenges Research Fund GCRF) Службы па даследаваннях і інавацыях Злучанага Каралеўства (United Kingdom Research & Innovation, UKRI).

Рэалізацыя праекта COMPASS у Беларусі стала магчымым дзякуючы перамозе Універсітэта Кента і створанага ім кансорцыума ў конкурсе заявак Даследчага фонду па глабальных выкліках Даследчых Саветаў Злучанага Каралеўства. Усяго на конкурс было пададзена звыш 500 заявак, адабрана для фінансавання 37 праектаў ва ўсіх галінах ведаў. COMPASS – адзіны праект, падтрыманы GCRF у галіне сацыяльных навук. Кіраўніком праекта з’яўляецца прафесар Алена Карасцялёва – дырэктар Цэнтра глабальнай Еўропы Школы палітыкі і міжнародных адносін Універсітэта Кента. У Беларусі праект COMPASS рэалізуецца сумесна гістарычным факультэтам і факультэтам міжнародных адносін, з удзелам Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў, іншых падраздзяленняў БДУ. Да ажыццяўлення мерапрыемстваў праекта акрамя выкладчыкаў і навуковых работнікаў актыўна прыцягваюцца аспіранты і студэнты розных факультэтаў.

У значнай ступені праект COMPASS стаў магчымы дзякуючы таму, што ў 2017–2018 гг. паміж Універсітэтам Кента і БДУ была рэалізавана першая ў гісторыі двухбаковых адносін шырокая праграма акадэмічных абменаў студэнтаў і выкладчыкаў (пры падтрымцы праграмы Еўрапейскага Саюза Erasmus+).

У рамках праекта COMPASS праводзяцца даследаванні і абмен вопытам у галінах адукацыі, эфектыўнага кіравання ва ўмовах развіцця інфармацыйных тэхналогій, міграцыйных працэсаў і рэгіянальнай бяспекі, ўстойлівага развіцця. Рыхтуюцца розныя сумесныя навуковыя і навучальныя публікацыі, вядзецца распрацоўка новых курсаў і праграм на англійскай мове, ажыццяўляецца падрыхтоўка шэрагу новых сумесных навуковых і адукацыйных праектаў. Своеасаблівым «скразным» прыярытэтам для беларускіх даследчыкаў выступае вывучэнне розных аспектаў інтэграцыі на еўразійскай прасторы.

Праект COMPASS паслядоўна падтрымлівае ініцыятывы, накіраваныя на ўмацаванне даследчага патэнцыялу БДУ ў сацыяльна-гуманітарнай сферы, пашырэнне міжнароднага навуковага і экспертнага дыялогу па значных для Беларусі пытаннях.

Так, 22–23 мая 2018 г. на базе БДУ адбылася Міжнародная канферэнцыі адкрыцця праекта COMPASS з удзелам прадстаўнікоў усіх універсітэтаў-партнёраў (Вялікабрытанія, Беларусь, Азербайджан, Узбекістан, Таджыкістан), а таксама прадстаўнікоў Экспертнага савета COMPASS, кіраўніцтва і прадстаўнікоў дыпламатычных місій шэрагу краін у Беларусі, прадстаўнікоў Еўрапейскай Камісіі, Даследчых Саветаў Злучанага Каралеўства, вядучых даследчыкаў з Вялікабрытаніі, ФРГ і іншых краін ЕС, Расіі, прадстаўнікоў органаў улады і кіравання, а таксама экспертаў з Рэспублікі Беларусь. Значнай падзеяй міжнароднага маштабу стала канферэнцыя Форума «Мінскага дыялогу» пад агульнай назвай «Усходняя Еўропа: у пошуку бяспекі для ўсіх», якая прайшла ў Мінску 23–25 мая 2018 г. і сабрала каля 500 экспертаў, палітычных і грамадскіх дзеячаў з некалькіх дзесяткаў краін свету. Партнёрам форуму выступіў БДУ, а праект COMPASS стаў адзіным стратэгічным партнёрам Форуму «Мінскага дыялогу».

За 2018 год прадстаўнікі БДУ прынялі ўдзел у міжнародных канферэнцыях і трэнінгах у Тарту (Эстонія), Рыме (Італія), Упсала (Швецыя), Кентэрберы і Лондане (Вялікабрытанія). Сумесна з азербайджанскімі калегамі ў лістападзе 2018 г. у г. Баку (Азербайджан) арганізаваны трэнінг па распрацоўцы і менеджменце міжнародных праектаў. Адноўлена работа ў БДУ студэнцкага клуба па брытанскіх парламенцкіх дэбатах. У межах праекта плануецца аказанне падтрымкі правядзенню навуковых мерапрыемстваў на базе БДУ. Так, у кастрычніку 2018 г. пры падтрымцы COMPASS прайшла канферэнцыя «Беларусь у сучасным свеце», цяпер – міжнародны навуковы форум «Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX стагоддзя».

У 2019 годзе актыўная праца у межах праекта COMPASS працягнецца. Так, запланаваны ўдзел беларускай дэлегацыі ў Брусэльскім навучальным візіце высокага ўзроўня праекта COMPASS (20–26 студзеня), а таксама Лонданскім форуме «Павышэнне ўстойлівасці ў Вялікай Еўразіі: праблемы і магчымасці» (28–29 студзеня). У красавіку 2019 г. у БДУ будзе праходзіць Міжнародная студэнцкая канферэнцыя праекта COMPASS.

*А.М. Назаранка,*
*старшы выкладчык кафедры крыніцазнаўства БДУ,*
*кіраўнік беларускай нацыянальнай каманды праекта COMPASS*